

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ДВАРЭЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»**

# Рэспубліканскі конкурс «Пазнай Беларусь»
## Сакавік. Этап 6. «Знакамітыя беларусы»
## «Цікавыя факты з жыцця Уладзіміра Караткевіча»

**Аўтар: Рыбак Паліна**

# ЛЮБІМАЯ КНІГА – “ТРЫ МУШКЕЦЁРЫ” А.ДЗЮМА

**Каля ложка пісьменніка на часопісным століку заўсёды ляжала кніга Аляксандра Дзюма “Тры мушкецёры”. Перш чым пачынаць стварэнне новага твора, Уладзімір Караткевіч перачытваў любімы твор і натхняўся на новыя ідэі.**

# У СВАІХ ТВОРАХ НЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЎ СЛОЎ, ЗАПАЗЫЧАНЫХ З ТАТАРСКАЙ МОВЫ

**Калі Караткевічу прыходзілася перакладаць свае творы на рускую мову, то ён заўсёды папярэджваў перакладчыкаў, каб пазбягалі татарскіх запазычанняў. Матываваў проста: не для таго беларусы пазбеглі манголататарскага іга, каб потым сваю мову іх словамі засмечваць.**

# ЗАХАПЛЯЎСЯ МУЛЬТФІЛЬМАМІ

**Караткевіч заўсёды праглядаў праграму тэлеперадач на тыдзень і выдзяляў чырвоным стрыжнем усе мультфільмы. Глядзеў іх з вялікім захапленнем, і калі родныя не папярэджвалі яго пра сеанс, то вельмі крыўдзіўся.**

# ЛЮБІЎ ПЛАВАЦЬ

**Уладзімір часта ездзіў з сябрамі адпачываць на мора. Ён настолькі любіў ваду, што мог у ёй сядзець гадзінамі бязвылазна і заплываць вельмі далёка. Сябры ўшчувалі, што так рабіць нельга, што яны турбуюцца, калі плывец прападае з гарызонту. Але пісьменнік на гэта адказваў, што ён ужо дарослы і нікому не абавязаны падпарадкоўвацца.**

**Ніколі не сябраваў дзеля нейкай выгады і ганарыўся тым, што мае экзатычныя знаёмствы**

У лісце, адрасаваным Валянціне Шчадрыной (20 студзеня 1972 г.) чытаем: «Среди моих друзей ксендзы из Вишнева и Пинска, рыбаки из Коктебеля, зьмеелов из Москвы, создатель новой философской системы — мужик из-под Любчи, да мало ли ещё кто. И чтобы я стал тратить дорогое время не на них, из дружбы с которыми я не извлекаю никакой выгоды, кроме дружбы и жизни, а на определение, „кто есть кто“, „кто с кем“, „кто за кого“, наконец „кто кого“ — я проклял бы самого себя.

# Любіў малявацць шаржы, карыкатуры







# Умеў (калі гэтага хацеў) зрабіць уражанне на дзяўчат

Як згадвала адна прыхільніца ягонай творчасці: «...Караткевіч тады літаральна пераўвасабляўся ў сваіх герояў — моцных, прыгожых, артыстычных шляхціцаў. Ён заварваў каву па адмысловым старажытным рэцэпце (таямніцу якога нікому не раскрываў), чытаў выбраныя месцы з Эвангелля (паводле словаў самога пісьменніка — „адной з лепшых (калі не самай лепшай) з гісторый, прыдуманых чалавецтвам за ўсё сваё стварэнне“), ставіў кружэлку з опэрнымі спевамі Забэйды-Суміцкага, запальваў сьвечкі, даваў чытаць „Митину любовь“ Івана Буніна. Але калі дзяўчына не адказвала ўзаемнасцю, то імгненна крыўдзіўся і, можна сказаць, выкрэсліваў яе са свайго жыцця...»